ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1982
9
ВЕРАСНЯ
ЧАЦВЕР
№ 25 (1363)

Выходзіць раз у тыдзень

Выдаецца з 1922 года.

"Беларускі універсітэт"

## тэлетайп

· Учора · Сёння · Заўтра ·

### ПЕРШАКУРСНІКУ

прысвячаўся канцэрт самадзейных артыстаў, які адбыўся ў актавай зале БДУ. У ім прымалі ўдзел вядомыя калектывы мастацкай самадзейнасці універсітэта: аркестр народных інструментаў, харавая капэла— старэйшы пеўчы калектыў БДУ, фальклорна-этнаграфічны ансамбль «Неруш», хор народнай песні выкладчыкаў і супрацоўнікаў, народны ансамбль танца «Крыжачок». Гледачам спадабаліся і песні, якія выконвалі студэнты Алег Ацьман і Уладзімір Васіленка.

**У. МАКАРЭВІЧ,**
**дырэктар**
**студэнцкага клуба.**

### ТУРБАЗА «БАЙКАЛ»

апладзіравала выкладчыкам і супрацоўнікам універсітэта — удзельнікам хору народнай песні. У час турысцкай паездкі яны выступілі перад адпачываючымі. У знак удзячнасці кіраўніку хору — выкладчыку інстытута культуры Л. В. Снапковай была ўручана Ганаровая грамата за актыўную культурна-масавую работу калектыву.

**З. АЛЯШКЕВІЧ.**

### ПЕРАМОЖЦАМ

у маладзёжным міжнародным турніры «Дружба» па класічнай барацьбе, які адбыўся ў Таліне, стаў В. Кожаль, студэнт другога курса геаграфічнага факультэта.

**В. РУДЗЯНКОЎ,**
**старшы выкладчык кафедры**
**фізічнай культуры і спорту.**

### АДБЫЛОСЯ

чарговае пасяджэнне прэзідыума прафкома, на якім абмяркоўвалася пытанне правядзення справаздач і выбараў у прафсаюзных групах і бюро факультэтаў.

**Н. ТУРОМША,**
**намеснік**
**старшыні прафкома.**

### ФІНАЛ

масавага лёгкаатлетычнага свята «Усесаюзнага дня аздараўленчага бегу і хадзьбы» адбудзецца 12 верасня ў парку Перамогі. Да яго рыхтуюцца студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі універсітэта, актыўна працуе аргкамітэт, праходзяць папярэднія спаборніцтвы.

**А. БАЛДЗІН,**
**старшыня спартыўнага клуба.**



## БДУ імя У. І. Леніна — ВА «Інтэграл»

### ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

АМАЛЬ два дзесяцігоддзі Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і ВА «Інтэграл» ажыццяўляюць сумесную падрыхтоўку спецыялістаў у галіне фізікі і хіміі паўправаднікоў. На прадпрыемстве працуе звыш 400 выпускнікоў універсітэта, якія добра зарэкамендавалі сябе не толькі як высокакваліфікаваныя спецыялісты, але і як умелыя арганізатары вытворчасці з шырокім грамадска-палітычным кругаглядам.

Гэта было адзначана на сумесным пасяджэнні бюро партыйнага камітэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і бюро партыйнага камітэта вытворчага аб'яднання «Інтэграл», на якім разгледжаны таксама задачы па ўдасканаленню работы вучэбна-навукова-вытворчага аб'яднання «БДУ імя У, І. Леніна — ВА «Інтэграл».

Стварэнне аб'яднання садзейнічала паляпшэнню мэтанакіраванай падрыхтоўкі спецыялістаў — выпускнікоў універсітэта. Дасягнуты станоўчыя вынікі ў арганізацыі і правядзенні сумесных палітычных і культурна-масавых мерапрыемстваў, грамадска-палітычнай практыкі студэнтаў.

У той жа час патрэбна адзначыць, што Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна можа больш накіроўваць сваіх выпускнікоў на ВА «Інтэграл». Патрабуе вырашэння і пытанне аб стварэнні кафедры, якая б адказвала за ўвесь комплекс вучэбных, навуковых і метадычных задач, звязаных з падрыхтоўкай спецыялістаў. Патрабуе паляпшэння матэрыяльна-тэхнічная база прафіліруючых кафедр.

Узнятыя праблемы былі дэталёва абмеркаваны і ўключаны ў сумесна прынятую пастанову.

**В. ІГНАТАЎ.**

**НА ЗДЫМКУ: у час сумеснага пасяджэння бюро партыйных камітэтаў універсітэта і ВА «Інтэграл».**

**Фота У. ЛІТОМІНА.**

● ЗДАБЫТАК ВУЧОНЫХ

## ШКЛАРЭЗ З... АЛЮМІНІЮ

БЕЗ ЦЯЖКАСЦІ можна разрэзаць шкло вострым краем алюмініевай пласцінкі, якая прайшла спецыяльную апрацоўку. Праўда, такі шкларэз ёсць пакуль толькі ў вучоных нашага універсітэта, якія прапанавалі арыгінальную тэхналогію нанясення ахоўнага і дэкаратыўнага пакрыцця на мяккі метал.

Каб надаць алюмінію цвёрдасць і колер, яго паверхню апрацоўваюць так, што яна пакрываецца найдрабнейшымі порамі. У гальванічнай ванне з дапамогай імпульсаў пераменнага току ў іх укараняюць мікрачасцінкі цвёрдага металу. У выніку счапленне нанесенага слою з алюмініем аказваецца ў два разы больш трывалым, чым звычайнае.

Такая апрацоўка істотна павышае зносаўстойлівасць дэталей, дазваляе надаваць ім разнастайную афарбоўку. Кобальт, напрыклад, афарбоўвае алюміній у чорны колер, сялен — у бежавыя таны, медзь можа надаваць зялёнае, вішнёвае і шэрае адценні.

Такія «фарбы» не выцвітаюць і могуць быць выкарыстаны пры афармленні панеляў радыёпрыёмнікаў, магнітафонаў, тэлевізараў, рознай бытавой тэхнікі, дэкаратыўнай апрацоўцы будынкаў.

**Наш кар.**

### ХАРЧОВАЯ ПРАГРАМА: НА ШЛЯХАХ РЭАЛІЗАЦЫІ

## СТАНЕ НІВА ШЧОДРАЙ

ПЫТАННЮ павышэння эфектыўнасці выкарыстання выпускаемых у краіне мінеральных угнаенняў, у прыватнасці калійных, удзяляецца шмат увагі. Асноўнай прычынай зніжэння эфектыўнасці хлорыстых калійных тукаў у працэсе прымянення іх пад розныя сельскагаспадарчыя культуры з'яўляецца хлор, які прысутнічае ў гэтых угнаеннях і адмоўна ўплывае як на колькасць, так і на якасць атрымліваемага ўраджаю.

У Белдзяржуніверсітэце, у лабараторыі меліярацыі ландшафтаў, пад кіраўніцтвам кандыдата біялагічных навук М. П. Іванова праводзяцца даследаванні па вывучэнню спосабаў стымулявання росту сельскагаспадарчых культур, асновай якіх з'яўляецца памяншэнне ўплыву хлору на рост і развіццё раслін і павышэнне ўраджайнасці. Гэта дасягаецца тым, што дозы азотных і фосфарных угнаенняў, якія ўносяцца вясной у глебу, павялічаны ўдвая ў параўнанні са звычайнымі для кожнай сельскагаспадарчай культуры. Колькасць калійных тукаў аптымальная. У выніку гэтага ўраджайнасць бульбы можна павысіць на 25,5—38,8 працэнта. Па гэтых даследаваннях М. П. Івановым і супрацоўнікамі лабараторыі атрымана аўтарскае пасведчанне ў снежні 1980 года.

Вясной мінулага года было прапанавана ўкараніць гэты спосаб вырошчвання сельскагаспадарчых культур, у прыватнасці бульбы, у шэрагу гаспадарак рэспублікі. Сярод іх быў і калгас «Камуніст» Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. Укараненне праводзілася ў цэнтральнай брыгадзе на плошчы 20 гектараў з бульбай сорту «Тэмп». Пры ўнясенні падвоеных доз азотна-фосфарных угнаенняў і высокай дозы хлорыстага калію ў поўнай сістэме мінеральных угнаенняў атрымана ўраджайнасць клубняў бульбы 285 цэнтнераў з гектара пры ўраджаі на кантролі — 185 цэнтнераў. Такім чынам, атрыманая прыбаўка склала 100 цэнтнераў з гектара, або 54,1 працэнта. Агульная прыбаўка з усёй плошчы — 2000 цэнтнераў. Гадавы эканамічны эфект склаў 22138 рублёў. Такія паказчыкі значна перавышаюць звычайныя сярэднераённыя ўраджаі.

Натуральна, што ўраджайнасць залежыць не толькі ад мінеральных і арганічных угнаенняў, а і ад правільнага выканання ўсяго комплексу мерапрыемстваў па вырошчванню бульбы. Гэта, у прыватнасці, своечасовая запраўка мінеральнымі тукамі пасеваў, унясенне на гектар 60—90 тон арганічных угнаенняў, аптымальная гушчыня пасеваў, правільны догляд і іншае.

Але на сучасным этапе важна не толькі павысіць ураджайнасць бульбы, але і палепшыць многія якасныя паказчыкі клубняў. Увагі заслугоўваюць даследаванні малодшых навуковых супрацоўнікаў аддзела аптымізацыі ўрадлівасці глеб Я. К. Кулікова і І. Я. Скурко, якія вызначаюць узровень бялку, крухмалу ў клубнях і іншыя якасныя паказчыкі. Устаноўлена, што выкарыстанне калійных угнаенняў разам з двайнымі дозамі азоту і фосфару зніжае таксічны ўплыў хлору на ўраджайнасць і якасць клубняў. Такім чынам даследчыкі праблемнай лабараторыі меліярацыі ландшафтаў уносяць свой уклад у ажыццяўленне Харчовай праграмы.

Зараз распрацаваная лабараторыяй тэхналогія вырошчвання сельскагаспадарчых культур укаранёна ў 12 гаспадарках Мінскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.

**Г. ГРЭЛЬ,**
**наш кар.**

# Каб сказалі людзі «дзякуй»

ГЭТА СТАЛА ўжо добрай студэнцкай традыцыяй—пачынаць новы навучальны год працай у калгасах і саўгасах рэспублікі. У вёсках ведаюць — верасень, значыць прыедуць студэнты. Дапамагаць. А што такое «бульба» для студэнтаў? Гэта і праца. Радасная, таму што патрэбная. І адпачынак. Цікавы, таму што ўсе разам. І каханне. Пяшчотнае, таму што гэта каханне...

«Бывалыя» — студэнты старэйшых курсаў — навучаць «першачкоў» спрытней збіраць ураджай, даравацъ дзяўчатам крыху падгарэўшую ежу, нягледзячы на стомленасць, даваць канцэрты мясцовым жыхарам. Аднаму не здолеюць яны навучыць — сябраваць. Пра гэта трэба паклапаціцца самім, бо дзе, як не ў сумеснай працы, убачыш сутнасць чалавека, зразумееш слабасці і недахопы кожнага, адчуеш моц сяброўскай дапамогі?

Ад'язджаюць проста першакурснікі, незнаёмыя і крыху разгубленыя, а вяртаецца здаровы, дружны, праверaны працай калектыў, — вось у чым сакрэт «бульбы». Жадаем вам хутчэй яго разгадаць. Тады і будзе што ўспомніць. І вогнішча, калі навакольле робіцца асабліва ўтульным, і шчырыя размовы, калі не заўважаеш, што стрэлкі гадзінніка перайшлі далёка за дванаццаць, і бясконцыя студэнцкія размовы пра тое, што вось трапіў некалі такі білет... Але самае галоўнае — словы падзякі за працу, якія ніколі не забудуцца, бо калі людзі кажуць «дзякуй», гэта заўсёды прыемна. Хай часцей гучаць яны ў ваш адрас!

КЛІЧА ВЕРАСНЁЎСКАЕ ПОЛЕ

# З В А Р О Т

## СТУДЭНТАЎ ФІЛАЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА ДА БАЙЦОЎ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ АТРАДАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

**У ЗНАМЯНАЛЬНЫ ГОД для нашай Радзімы — год 60-годдзя Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, — выконваючы рашэнні майскага [1982 г.] Пленума ЦК КПСС, студэнты філалагічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна прымаюць на сябе павышаныя сацыялістычныя абавязацельствы і заклікаюць усе сельскагаспадарчыя атрады БДУ імя У. І. Леніна разгарнуць спаборніцтва пад дэвізам «60-годдзю СССР — ударную вахту на ўборцы ўраджаю 1982 года».**

**Студэнты філалагічнага факультэта абавязуюцца:**

**— берагчы кожную рабочую хвіліну, не дапускаць страт ураджаю, прытрымлівацца правілаў тэхнікі бяспекі;**

**— штодзённа перавыконваць норму выпрацоўкі;**

**— прыняць актыўны ўдзел у аперацыях «Салдацкі ліст», «Памяць»; запісваць успаміны ветэранаў вайны, аказваць шэфскую дапамогу сем'ям загінуўшых воінаў і ветэранаў вайны і працы;**

**— узяць шэфства над мясцовымі школамі; кожны студэнт абавязуецца правесці гутарку з сельскай моладдзю пра БДУ імя У. І. Леніна; правесці ў кожным класе ўрокі мужнасці і гераізму, прысвечаныя 60-годдзю СССР;**

**— правесці дзень ударнай працы, прысвечаны 60-годдзю СССР;**

**— арганізаваць рэйд «Камсамольскага пражэктара» па папярэджанню страт ураджаю;**

**— арганізаваць 25 выступленняў агітбрыгад атрадаў перад працаўнікамі сельскай гаспадаркі ў клубах, на зернетаках і ў полі.**

**Студэнты філалагічнага факультэта поўныя рашучасці выканаць прынятыя сацыялістычныя абавязацельствы, ударнай працай і актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю на сельгасработах азнаменаваць 60-годдзе ўтварэння СССР.**

*Зварот прыняты на агульным сходзе сельскагаспадарчых атрадаў філалагічнага факультэта 4 верасня 1982 года.*

**БССР**

# СІЛА— У БРАТЭРСТВЕ

9 ВЕРАСНЯ балгарскі народ разам з усім прагрэсіўным чалавецтвам святкуе Дзень нацыянальнага вызвалення Балгарыі ад фашызму. 38 гадоў назад на балгарскую зямлю прыйшоў савецкі салдат, пасланец міру і дружбы, салдат-вызваліцель. Для шматпакутнага народа Балгарыі пачалася сацыялістычная эра. За гэты час братняя краіна ператварылася ў высокаразвітую індустрыяльна-аграрную рэспубліку. У авангардзе гэтых здзяйсненняў ідзе Дзімітраўскі Камуністычны Саюз Моладзі, унукі і дзеці тых, хто плячо ў плячо з «рускім Алёшам» змагаўся за новае жыццё.

Брыгадзірскі рух у Балгарыі — гэта студэнцкі будаўнічы рух у СССР. У гэтым годзе камітэт камсамола БДУ імя У. І. Леніна і камітэт ДКСМ Ямбольскага педагагічнага інстытута імя Д. Благоева (НРБ) заключылі дагавор аб абмене студэнцкімі будаўнічымі атрадамі. І вось на беларускую зямлю, за якую змагалася і загінула слаўная дачка балгарскага народа Лілі Карастаянава, прыехаў студэнцкі будаўнічы атрад з Балгарыі. У маладзёжным савецка-балгарскім лагеры іх сустрэў камуністычны атрад імя Георгія Дзімітрава гістарычнага факультэта.

27 юнакоў і 12 дзяўчат, савецкіх і балгарскіх, пачалі свой трэці працоўны семестр. Дваццаць адзін дзень савецкія і балгарскія студэнты ўзводзілі аб'екты ў калгасе «17 верасня» Нясвіжскага раёна. Вынікі працы—асвоена 56 тысяч рублёў капіталаўкладанняў, падрыхтаваны да ўводу ў дзеянне малочнатаварная ферма і гараж для сельскагаспадарчай тэхнікі. Цікава праводзілі будатрадаўцы і свой вольны час. Вечары дружбы і дыскатэкі, экскурсіі і размовы, паездка ў легендарную Брэсцкую крэпасць-герой... Байцы атрада дапамагалі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны — жыхарам вёскі Высокая Ліпа. Вялікую палітыка-выхаваўчую работу правoдзіў атрад сярод мясцовага насельніцтва.

Пасля працы балгарскія сябры наведалі горад-герой Мінск, сталіцу Літвы Вільнюс, Ленінград. А потым—расставанне. Апошнія ўсмешкі. Слязінкі на дзявочых тварах. І доўга яшчэ несліся над Варшаўскім вакзалам Ленінграда словы падзякі і развітання, якія гучалі на рускай і балгарскай мовах.

**В. ШАДУРСКІ,**
**камандзір СБА імя Г. ДЗІМІТРАВА.**
**І. СЯРГЕЕНКА,**
**камісар СБА імя Г. ДЗІМІТРАВА.**







*ДЗЕ ТОЛЬКІ ні праляглі гэтым летам дарогі байцоў СБА БДУ імя У. І. Леніна, дзе толькі ні гучала беларуская мова. І ў Цюменскай вобласці, і ў Малдавіі, і ў азёрнай Карэліі, і на будаўніцтве Байкала-Амурскай чыгункі працавалі студэнты універсітэта. Горача вітала іх братняя Балгарыя, гарады і вёскі ГДР. І, вядома, родная беларуская зямля. Юнакі і дзяўчаты ў форме байцоў СБА узводзілі школы і бальніцы, жылыя дамы і вытворчыя карпусы, дапамагалі калгасам і саўгасам нарыхтоўваць кармы, убіраць ураджай, працавалі праваднікамі на чыгунцы, выхавацелямі ў дзіцячых дамах... Амаль сто універсітэцкіх атрадаў прынялі ўдзел у трэцім працоўным семестры. Добрыя справы студэнтаў універсітэта можна перавесці ў тоны і метры, рублі і гектары, але з чым можна параўнаць, якімі лічбамі і паказчыкамі вымераць шэфскую дапамогу студэнтаў школам і дашкольным установам, ветэранам вайны і працы?*

*Гісторыяй стаў трэці семестр лета-82. Наперадзе — новыя дарогі юнакоў і дзяўчат, якіх пакліча ў рады СБА прага ўдарных спраў, нялёгкая рамантыка працоўных будняў.*

*А. ВАЛОШЫН.*
*Фота аўтара.*

**ГДР**

# І ЦІКАВА, І АДКАЗНА

Інтэрнацыянальны СБА «Мінск-82» — так мы называліся тры тыдні таму назад. Мы — гэта 19 студэнтаў БДУ імя У. І. Леніна, якім трэба было стаць адзіным цэлым, мы — гэта 19 характараў, якім наканавана стаць адзіным моцным характарам. Адным словам, мы — студэнты гістарычнага, механіка-матэматычнага, юрыдычнага, радыёфізічнага, хімічнага і фізічнага факультэтаў.

А пачалося ўсё вясной 1982 года. Наш першы арганізацыйны сход, першыя праблемы, надзеі, справы... Калі ўжываць мову дзелавую, будатрадаўскую, — гэта быў падрыхтоўчы перыяд. Добра папрацавалі ў гэты час нашы кіраўнікі, камандзір атрада Уладзімір Ільіч Мядзянік, камісар Аляксандр Жылінскі. І вынікі гэтай працы не прымусілі сябе доўга чакаць: паявіўся першы нумар газеты, хутка дапрацавалі сцэнарый агітбрыгады. У той час самым папулярным у нас было слова «першы», і гэта не ад малога слоўнікавага запасу, проста для нас многае сапраўды было ўпершыню. Мы ехалі на працу ў ГДР, а гэта вельмі адказна — прадстаўляць наш універсітэт за мяжой. Тут да кожнага байца прад'яўляюцца найвышэйшыя патрабаванні.

Сваёй працай мы даказалі, што адпавядаем ганароваму званню байца інтэрСБА: план быў выкананы на 195 працэнтаў, а ў сацыялістычным спаборніцтве міжнароднага лагера занялі трэцяе месца, ёсць у атрада і ганаровыя граматы.

**В КОЎШ,**
**студэнт гістарычнага факультэта, баец інтэрСБА «Мінск-82».**

# Сябры працуюць побач

**НРБ**

ТРЭЦІ ПРАЦОЎНЫ семестр для байцоў інтэрнацыянальнага СБА «Арсенал» праходзіў у сонечнай Балгарыі. Асноўны састаў — байцы камуністычнага атрада «Арсенал», які працаваў у мінулым годзе на будаўніцтве дзіцячых пляцовак у Маскоўскім раёне г. Мінска, на аднаўленні партызанскіх зямлянак у Лаўскіх лясах. У гэтым годзе мы працавалі на археалагічных раскопках сталіцы фракійскай дзяржавы Кабіле.

Нам было даручана раскапаць рымскую лазню. Спачатку здавалася, што праца ідзе марудна, але дырэктар Ямбольскага гістарычнага музея Нэлі Танчава сказала, што мы выконваем штодзённа па тры нормы. Радавалі кожная адкрытая кладка сцяны, нават самы маленькі чарапок збана. 31 ліпеня рымская лазня цалкам вызвалілася ад шматвяковага пласту зямлі. Для нас гэта было сапраўдным святам.

Разам з намі працавалі студэнты гістарычнага факультэта Сафійскага універсітэта імя К. Ахрыдскага. Нас аб'ядноўвала не толькі цікавая праца, але і вечары дружбы, дыскатэкі, сяброўскія размовы. Разам спявалі савецкія і балгарскія песні, захапляліся танцамі народаў нашых краін. Не забудуцца і сустрэчы, якімі шчодра адарыла нас Балгарыя.

Что мне снег, что мне зной,
Что мне дождик проливной,
Когда мои друзья со мной—

гэтай песняй сустракалі нас навучэнцы рускай гімназіі імя В. Карагезава ў горадзе Ямболе. Уважліва слухалі дзеці расказ пра нашу краіну, рэспубліку, пра Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Прыемна было, што гімназісты добра ведаюць і любяць рускую мову, рускую класічную і савецкую літаратуру. Усюды нас акружалі шчырыя, добразычлівыя людзі.

У вольны час мы зрабілі шмат цікавых экскурсій. Бачылі легендарную Шыпку, гарады Вяліка Тырнава, Габрава, якія здзівілі нас своеасаблівай архітэктурай і арыгінальнасцю. Былі і іншыя сустрэчы. Сустрэчы з мінулым, апаленым вайной.

Стоит над горою Алеша,
Алеша, Алеша,
Стоит над горою Алеша,
В Болгарии русский солдат.

Хто не ведае гэтай песні! Да помніка Алёшу ляглі кветкі і ад байцоў інтэрСБА «Арсенал».

...Сонечным ранкам мы развіталіся з Балгарыяй, са сваімі сябрамі Тодарам Стоевым, Васілам Міхалчавым і іншымі. Але дружба, якая нарадзілася і замацавалася ў працы, застанецца назаўсёды, для яе няма межаў.

**Т. СОТЧАНКА,**
**камандзір СБА «Арсенал».**

## НАВЕЧНА Ў ПАМЯЦІ НАРОДНАЙ

# ПАРАЖАЮЧЫ МЕЧ

### ДА 40-ГОДДЗЯ СТАЛІНГРАДСКАЙ БІТВЫ

СЯРОД шматтысячнага калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна можна бачыць нямала людзей з пасівеўшымі скронямі, з ордэнскімі планкамі на грудзях. Гэта ветэраны Вялікай Айчыннай. Яны карыстаюцца тут вялікай павагай. І не толькі таму, што працуюць на любых пастах з маладым запалам, творча, але і таму, што ўсе яны — людзі актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Больш трохсот чалавек налічвае ў сваіх радах арганізацыя ветэранаў БДУ. А якой зайздроснай энергіяй, невычэрпнай ініцыятывай валодае кожны з іх! Ветэранаў па праву лічаць сваімі баявымі памочнікамі ў прапагандзе гераікі мінулых баёў, выхаванні ў студэнтаў высокіх маральных якасцей партыйная, камсамольская і прафсаюзная арганізацыі. Ветэраны — арганізатары многіх добрых спраў і пачынанняў. Гэта і адноўленая наглядная агітацыя ў музеі гісторыі універсітэта, і сустрэчы з героямі вайны і працы, і выступленні франтавікоў перад моладдзю, і арганізацыя канферэнцый чытачоў па кнігах Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне», «Цаліна» і «Успаміны». Цяпер былыя франтавікі актыўна рыхтуюцца адзначыць 40-годдзе вялікай бітвы на Волзе. Праведзены канферэнцыі чытачоў па кнізе маршала артылерыі К. П. Казакова «Всегда с пехотой, всегда с танками».

Калектыў універсітэта падтрымлівае цесныя сувязі з воінамі Н-скай часці. Многія мерапрыемствы праводзяцца сумесна з байцамі і камандзірамі. Пра адну з паездак выкладчыкаў і студэнтаў у Н-скую часць і пойдзе наш расказ.

Шэфскія сувязі з воінамі Савецкай Арміі — даўняя і добрая традыцыя БДУ. Ды і як жа інакш, калі значная частка студэнтаў і выкладчыкаў — салдаты, сержанты і афіцэры запасу. Тут з гонарам успамінаюць, што ва універсітэце ў свой час займаўся двойчы герой Савецкага Саюза Я. У. Смушкевіч, цяпер працуюць Героі Савецкага Саюза Д. П. Жмуроўскі, былы камандзір экіпажа ІЛ-2 М. Я. Зайцаў. А Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў, у той час камандзір палка, быў выкладчыкам на кафедры ваенна-дапрызыўнай падрыхтоўкі.

Дружба, што пачалася ў далёкія гады, мацнее і развіваецца. Разам з воінамі Н-скай часці была праведзена канферэнцыя чытачоў па кнізе В. І. Чуйкова «Сражение века», прысвечанай 40-годдзю Сталінградскай бітвы.

Як дарагіх гасцей, сустрэлі вучоных і студэнтаў універсітэта воіны. Прапанаваная шэфамі тэма канферэнцыі была актуальнай і супадала з планамі палітработы падраздзяленняў па прапагандзе гераічных традыцый. Уступнае слова сказаў старшыня савета ветэранаў вайны БДУ, дацэнт кафедры гісторыі БССР І. В. Марчанка. Ён падкрэсліў, што вялікая перамога пад Сталінградам, заваяваная савецкім народам і яго Узброенымі Сіламі, — адна з найбольш слаўных старонак гераічнага летапісу Вялікай Айчыннай вайны. Яе натхніцелем і арганізатарам з'яўляецца ленінская партыя камуністаў, якая змагла мабілізаваць людскія і матэрыяльныя рэсурсы краіны і накіраваць іх на дасягненне вялікай мэты — карэннага пералому ў ходзе вайны.

Цяжка перадаць словамі тое ўражанне, якое зрабілі на воінаў расказы заслужанага работніка вышэйшай школы БССР, доктара гістарычных навук, прафесара Г. М. Трухнова, доктара юрыдычных навук, прафесара І. А. Юхо і іншых выкладчыкаў БДУ. Справа ў тым, што яны, у тыя дні яшчэ зусім юныя, знаходзіліся ў самым пекле баёў, разам з аднапалчанамі стойка абаранялі крэпасць на Волзе, а затым ішлі ў наступленне. Іх натхнялі на подзвігі прыклады герояў, у тым ліку абаронцы «Дома Паўлава». Гэты невялікі гарнізон, які праявіў здзіўляючую стойкасць і адвагу, увасабляе магутнасць і непераможнасць ленінскай дружбы народаў. «Дом Паўлава» абаранялі рускія Афанасьеў, Грыдзін, украінцы Глушчанка, Даўжэнка, Івашчанка, Якіменка, татарын Рамазанаў, грузін Масіяшвілі, казах Мурзаеў, узбек Дурдыеў, таджык Турганаў...

Бессмяротную славу заваявалі героі Сталінграда. Яны выстаялі, самі перайшлі ў наступленне, акружылі і ўзялі ў палон 300-тысячную групіроўку нямецка-фашысцкіх войск.

Зараз на Мамаевым Кургане ўзвышаецца велічная скульптура маці-Радзімы, якая заклікае савецкіх людзей быць заўжды напагатове. Узнесены над мемарыялам меч Сталінграда— не толькі сімвал. Гэта папераджальны знак для тых, хто задумвае новыя авантуры, шукае шляхі да заваявання сусветнага панавання. Усіх, хто адважыцца напасці на нашу Радзіму, на дзяржавы сацыялістычнай садружнасці, чакае такі ж лёс, які спасціг нямецка-фашысцкія войскі пад Сталінградам.

Вось аб чым паведамілі ўдзельнікі Сталінградскага бою. Іх жывое слова з душэўным хваляваннем успрымалася воінамі васьмідзесятых гадоў. І яно, безумоўна, будзе ўвасоблена ў канкрэтныя ратныя справы, дапаможа павышэнню майстэрства, боегатоўнасці і пільнасці.

Праведзеная сумесна з воінамі канферэнцыя чытачоў прайшла з вялікай карысцю, а ў савета ветэранаў, які ўзначальвае былы палітработнік, чалавек нястомнай энергіі І. В. Марчанка, новыя планы, новыя задумкі. На чарзе арганізацыя вечара дружбы народаў, прысвечанага 60-годдзю ўтварэння СССР. Яго намячаецца правесці ў клубе універсітэта. У госці будуць запрошаны воіны падшэфнай часці.

**А. СЫСОЕЎ.**

# СУСТРЭЧА ПАД МІРНЫМ НЕБАМ

ЧАС УСЁ БОЛЬШ і больш аддаляе ад нас векапомныя дні Вялікай Айчыннай. Час не толькі загойвае раны, час няўмольны. Радзеюць некалі шчыльныя шарэнгі франтавікоў і партызан, то аднаго, то другога баявога таварыша выхопліваюць з нашых радоў раны мінулай вайны. Ды толькі жыве ў сэрцах савецкіх людзей нязгасны агонь памяці аб тых, хто адстаяў незалежнасць Радзімы, адваяваў у жорсткіх баях мір для міру, свабоду для свабоды. Што там дзесяцігоддзі! — стагоддзям не патушыць гэты агонь, не прытупіць боль аб стратах, не засціць твары і вочы загінуўшых і жывых герояў. Тугія вузлы памяці зберагуць для нашчадкаў праўду аб тых днях...

У 1940 годзе ў Мар'інай Горцы было адкрыта Пухавіцкае пяхотнае ваеннае вучылішча, курсантам якога мне пашчасціла быць. Для многіх маіх сяброў гады навучання ў ППВВ з'явіліся сапраўднай школай салдацкай дружбы, якую яны затым пранеслі праз агонь вайны ад Волгі да логава фашысцкага звера.

І вось праз сорак год, напярэдадні 38-й гадавіны вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у Мар'інай Горцы сабраліся былыя курсанты, камандзіры і палітработнікі вучылішча. Шчыра віталі жыхары Пухавіцкага раёна прадстаўнікоў розных рэспублік, сыноў нашай шматнацыянальнай Радзімы. Яны наведалі музей рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы сярэдняй школы № 3 горада Мар'іна Горка, пабывалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і гаспадарках раёна, наведалі Хатынь, Курган Славы.

Хвалюючай была сустрэча выпускнікоў вучылішча са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ імя У. І. Леніна. Уважліва слухалі ўдзельнікі сустрэчы ўспаміны ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. А ім было аб чым расказаць: сярод выпускнікоў вучылішча Героі Савецкага Саюза П. В. Бачкароў, В. П. Стрыгін, тут выкладаў праслаўлены палкаводзец, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза І. І. Якубоўскі. Многія выпускнікі ППВВ вызвалялі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускую зямлю.

Затым удзельнікі сустрэчы ўсклалі кветкі да помніка студэнтам і выкладчыкам БДУ імя У. І. Леніна, якія загінулі ў гады вайны, наведалі музей універсітэта, бібліятэку, вучэбныя кафедры.

— Пакідаючы гераічную беларускую зямлю, мы шчыра ўдзячны за гасціннасць і цёплы прыём рэктарату, парткому, савету ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны БДУ імя У. І. Леніна, усім тым, хто дапамог праз сорак гадоў сустрэцца аднапалчанам, тым, у чыіх сэрцах жыве памяць аб гераічным мінулым савецкага народа, — сказаў старшыня савета ветэранаў Пухавіцкага пяхотнага ваеннага вучылішча М. М. Аляшкевіч.

**М. ЮЗАФОВІЧ,**
**выпускнік ППВВ,**
**супрацоўнік кафедры фізікі цвёрдага цела.**



# ПАКЛОН табе, БДУ

ЗНОЎ АЖЫЛІ універсітэцкія кафедры, напоўніліся рознагалосым, рознаязыкім рабочым гоманам аўдыторыі, лабараторыі, чытальныя залы. Пачаўся новы навучальны год.

Для тых, хто зноў прыехаў на вучобу ў Савецкі Саюз — замежных навучэнцаў з Нікарагуа, ГДР, Кубы, ЧССР, Грэцыі, Іарданіі і іншых краін, — гэта першае знаёмства з нашым горадам, з універсітэтам, першыя сустрэчы з выкладчыкамі, з новымі сябрамі. А для 61 замежнага студэнта з 10 краін— ЧССР, ПНР, ГДР, Кубы, Манголіі, Эфіопіі, Афганістана, Гвінеі, Партугаліі, Экватарыяльнай Гвінеі — прайшоўшы навучальны год стаў знамянальнай падзеяй: у святочнай абстаноўцы ім былі ўручаны дыпломы выпускнікоў нашага універсітэта.

Уручаючы дыпломы, прарэктар па міжнародных сувязях Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна А. В. Шарапа выказаў надзею, што ўсе, хто ў гэты дзень атрымлівае пуцёўку ў творчую працоўную дзейнасць, будуць з гонарам несці званне выпускніка БДУ імя У. І. Леніна, плённа працаваць у імя прагрэсу сваіх краін і ўсяго чалавецтва, аддадуць усе сваё сілы і веды справе міру і шчасця ўсіх людзей нашай планеты.

10 чалавек атрымалі таксама пасведчанні аб заканчэнні курса «Методыка выкладання рускай мовы як замежнай», якія ўручыў загадчык кафедры рускай мовы па назучанню замежных студэнтаў асноўных факультэтаў В. В. Равіцкі.

У заключэнне ўрачыстага сходу са словамі падзякі выступілі выпускнікі.

— Мы ніколі не забудзем тых выкладчыкаў, якія, не шкадуючы сваіх сіл, часу, дапамагалі нам як у вучобе, так і ў вырашэнні бытавых праблем. Яны вучылі нас быць не толькі добрымі спецыялістамі, але стараліся выхаваць нас сапраўднымі людзьмі, якія не баяцца цяжкасцей і змагаюцца за шчасце народаў усяго свету, — сказаў ад імя афрыканскіх студэнтаў выпускнік фізічнага факультэта Контэ Амаду (Гвінея).

— Нізкі паклон табе, універсітэт, — да гэтых слоў выпускніцы філалагічнага факультэта Эвы Касапуд (ПНР) далучаюцца і ўсе астатнія замежныя навучэнцы.

**У. БУДАЙ,**
**старшы выкладчык.**

# «УВАГА: ДЗЕЦІ!»

**УСЕСАЮЗНЫ РЭЙД**

СЯРОД МНОГІХ самых разнастайных мер, што накіраваны на захаванне здароўя і жыцця дзяцей, важнае месца займае прафілактыка траўматызму. З усіх відаў траўматызму самым цяжкім з'яўляецца транспартны. Таму пытанне прадухілення дзіцячага транспартнага траўматызму патрабуе неаслабнай увагі школы, бацькоў, ДАІ і ўсіх грамадзян. У нашым горадзе пастаянна праводзяцца масавыя мерапрыемствы, накіраваныя на далейшае вывучэнне і замацаванне Правілаў дарожнага руху. Вялікае значэнне маюць рэйды, якія праводзяцца супрацоўнікамі ДАІ і грамадскасцю. Задача іх заключаецца ў тым, каб кантраляваць выкананне гэтых правілаў.

Надышоў новы навучальны год. Шматлюдна стала на вуліцах горада. У школу спяшаюцца дзеці, у інстытуты— студэнты. І ўсюды іх шлях перасякаецца з патокам транспарту. За лета і дзеці і дарослыя адвыклі ад мноства транспарту, і таму ўжо стала традыцыйным кожны год у гэты напружаны час праводзіць аперацыі або рэйды, накіраваныя на тое, каб ахаваць іх ад няшчасных выпадкаў і дапамагчы правільна скаардынаваць свае паводзіны на вуліцах.

З 1 да 30 верасня ў Мінску аб'яўлены Усесаюзны рэйд «Увага: дзеці!». У падрыхтоўцы да яго прынялі ўдзел як супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі, так і адказныя работнікі дзяржаўных і грамадскіх арганізацый. На жнівеньскіх нарадах работнікаў народнай асветы разглядаліся пытанні, звязаныя з бяспекай руху дзяцей, праведзены практычныя заняткі з дружыннікамі, замацаванымі за кінатэатрамі, дамамі культуры прафсаюзаў, абследаваны тэрыторыі, што прылягаюць да школ. Усе гэтыя мерапрыемствы накіраваны на паляпшэнне арганізацыі дарожнага руху.

У гэтым годзе 20,5 тысячы хлопчыкаў і дзяўчынак упершыню пераступяць парог школы. Гэта радасная падзея ў сям'і і ў той жа час трывожная. Бацькоў хвалюе, ці зможа іх дзіця самастойна пераходзіць вуліцу, ці не здарыцца няшчасце? У школах уведзена абавязковае вывучэнне Правілаў дарожнага руху. Пачынаючы з першага класа дзеці ўдзельнічаюць у вучэбных экскурсіях па гораду, у вікторынах і святах, прысвечаных бяспецы дарожнага руху. Бацькам таксама трэба дапамагаць дзецям авалодваць гэтай азбукай. На першым часе трэба праводзіць і сустракаць іх са школы. Ідучы ад школы да дому, падрабязна тлумачыць дзецям значэнне дарожных знакаў, якія сустракаюцца на іх шляху, расказваць, дзе можна пераходзіць вуліцу, як хадзіць па тратуарах.

Рэйд «Увага: дзеці!» праводзіцца ў інтарэсах усяго насельніцтва. Аказваць дапамогу паспяховаму яго правядзенню — задача кожнага з нас.

**Д. ШЭЛЕГ,**
**супрацоўнік ДАІ**
**г. Мінска.**

# НАРАЧ — возера дружбы



● ВЯРТАННЕ Ў ЛЕТА ● ЛЯ ГЭТЫХ СОСЕН НЕЛЬГА НЕ СПЯВАЦЬ ● СВЯТА НЕПТУНА ● ВЕРНЫЯ СПАДАРОЖНІКІ — КНІГІ ●





АДЗВІНЕЛІ НАД НАРАЧЧУ песні на розных мовах, адцвіло стракатым дыванам лета. Цешыць успамін пра тыя дарагія дзянькі. Колькі новых сяброў, добрых спраў, колькі дагэтуль невядомага падарылі студэнцкія канікулы!

Інтэрнацыянальны спартыўна-аздараўленчы лагер БДУ размешчаны, бадай, у самым прыгожым кутку Беларусі — на беразе Нарачы. Утульныя блакітныя домікі паўсталі святочным карагодам, хаваючыся пад магутнымі соснамі. У цэнтры — пляцоўка для збораў і лінеек. Тут пачыналася лета і сяброўства, адсюль беглі на ранішнюю зарадку, ехалі на працу ў калгас, адпраўляліся ў падарожжы. Тут і развітваліся з лагерам, з Нараччу.

Побач з лагерам баскетбольныя і валейбольныя пляцоўкі, добрае футбольнае поле. Знойдзецца месца і для цяжкаатлетаў. Жадаеш паказаць сваю моц — калі ласка, штурхай двухпудовік у паветра! Ёсць і сталоўка-карміліца. З якім апетытам падмацоўваліся мы тут пасля добрай працы! А вунь і Нарач (усяго дзве хвіліны хады), то ціхае і ласкавае, то шумлівае і неспакойнае, але заўсёды добрае і прыветлівае. Цёплыя летнія дзянькі далі магчымасць уволю накупацца ў чысцюткай празрыстай вадзе, пакатацца на лодках, пасядзець з вудаю, пачытаць на беразе кнігу. Тут асабліва адчуваецца, што ўсё гэта тваё, дарагое, роднае. Лясныя сцежкі і празрыстыя крыніцы, магутныя дрэвы і высокія зоркі. Як без іх?

Коціцца на адпачынак сонейка, пусцеюць пляжы... Але не наступае цішыня. На танцавальнай пляцоўцы пачынаецца атрадны канцэрт. Чаго тут толькі не пабачыш. Танцуюць і спяваюць, расказваюць цікавыя гісторыі і смяюцца. Жартам няма канца. І не знікае ўсмешка з твараў гледачоў. Дружнымі апладысментамі яны праводзяць кожнага выканаўцу.

...Нарачанскія вечары. Як вас не ўспамінаць! «Ой рана на Івана»... — над вадою павольна плыве народная песня. Дзяўчаты ў нацыянальным адзенні вядуць карагод. Галасы мацнеюць, басамі дапамагаюць хлопцы, і песня шырыцца, дужэе і лунае на той бераг возера, дзе вялікім чырвоным кругам узыходзіць месяц. Той, хто памятае гэты купалаўскі вечар, заўсёды з цеплынёй будзе ўспамінаць пра цудоўнае свята беларускай паэзіі. «Ля гэтых сосен нельга не спяваць...»

Традыцыяй стала праводзіць у лагеры свята Нептуна. Вось ужо дзе сапраўднае марское царства: і спаборніцтвы на спрыт і моц, і гонкі на лодках. Тут так і глядзі, бо за каўнер ці вадзіцы плюснуць, ці ў возера па загаду Няптуна кінуць!



Шапоча меддзю дрэў маладая восень, а ў думках зноў і зноў вяртанне ў лета, да сяброў. Адзін з маіх знаёмых, студэнт з Лівана Хасан сказаў:

— Вельмі задаволены, што трапіў сюды. Я шмат чуў пра Беларусь, але толькі тут, на Нарачы, убачыў, якая яна прыгожая, багатая на добрых людзей, заўважыў яе непаўторнасць і хараство.






Я спадзяюся, што Хасану зразумела і дорага наша мінулае. Сустрэчы з ветэранамі вайны і працы, падарожжы па мясцінах баявой і працоўнай славы вельмі ўразілі замежных студэнтаў.

...Крыху сумна сёння, што доўга не пабачу возера Нарач, але радасна, што звыш 600 юнакоў і дзяўчат палюбілі яго, возера сяброўства, гэтак жа моцна, як і я.

**А. КЛЯШЧУК.**

Фота аўтара.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

9 верасня 1982 г.
Зак. 1639. АТ 21445

220080, МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 3. ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар В. П. ВАРАБ'ЁЎ